## 23. ХІТРЫ ХОМКА

Перамогу ў Вялікая Айчыннай вайне здабывалі танкамі, самалётамі, аўтаматамі. Жыццямі салдатаў. Была вайна з выбухамі і стрэламі, і вайна гэта ўшанавана, яна ў памяці на стагоддзі. А была вайна ціхая, і пра яе чамусьці гэтак жа ціха забылі. А забываць нельга.

У барацьбе без аўтамата і гранаты ўдзельнічала большая частка насельніцтва акупаванай Беларусі. Ціхае народнае супраціўленне захопнікам працягвалася з сорак першага па сорак чацвёрты. У гэтай вайне беларусы перамаглі. Як? Змаглі выжыць. Ці ж не Вялікая Перамога? Аб сваёй ціхай вайне мне расказала Таццяна Фамінічна Гузава.

Яе, шаснаццацігадовую дзяўчынку, вайна напатакала ў Мінску. У сталіцы Таццяна Гузава вучылася на зубнога тэхніка. Нямецкія бомбы прымусілі бегчы прэч з нябяспечнага горада. Разам з сяброўкай яна пехатой адправілася на радзіму, у вёску Галавічы, што ў Дрыбінскім раёне. Пад немцамі Таццяна Фамінічна пражыла тры гады.

“Калі мы прыйшлі з Мінска ў Галавічы, аднавяскоўцы ўжо тыдзень як бачылі немцаў. Тыя ў вёску не заязджалі, праехалі побач, па дарозе Горкі-Чавусы-Магілёў, які будавала яшчэ Кацярына Другая. У нашай вёсцы былі чатыры аднаасобнікі, якія не пайшлі ў калгас. Дык яны пабралі абразы, ручнікі і пабеглі да шляху сустракаць немцаў. Сястра мая малодшая, Маня, туды бегала з сяброўкамі. Пабралі белыя хусцінкі, зрабілі з іх сцягі, крычалі: “Мы здаёмся”. Немцы ехалі на матацыклах, на машынах. Не спыняліся.

У Галавічах немцы адразу распусцілі калгас. У Дрыбіне арганізавалі Магістрат. Раздалі людзям зямлю. Дзялілі на душы, на малых дзяцей не давалі. Нам далі на чатыры душы: на мяне, сястру, бацьку і маці. Атрымалася каля чатырох гектараў. Падзялілі калгасныя будынкі, коней. Нам далі жарабя двухгадовае, а дзядзьку, брату бацькаваму, далі добрага каня. Падзялілі таксама хлеб. Бацька да вайны працаваў у магазіне, маці рабіла ў калгасе. Давалі хлеб толькі былым калгаснікам. Таму нам дасталося мала. А сям’я была не маленькая: чацвёра дзяцей і бацькі, шэсць чалавек. Таму той год галадалі. Рвалі лебяду, з мукой мясілі хлеб.

Бацька хадзіў працаваць на мельніцу, рамантаваў там нешта, прыносіў дахаты муку. Што было не знайсці, дык гэта соль. Прыходзілася браць салітру, што завезлі ў калгас перад вайной. Шукалі яе, замочвалі, адстойвалі ў вёдрах, злівалі ў бутэлькі, хавалі пад падлогу, бо яе маглі ўкрасці.

Збіралі яйкі, масла. Насілі на кірмаш у Дрыбін, прадавалі. Грошы хадзілі нашы, савецкія рублі. Марак тых, нямецкіх, ніхто ў вочы не бачыў. Сястра з’ездзіла ў Воршу і купіла соль. Вось тады мы зажылі! Змаглі нават сала пасаліць. Што ў нас было? Свінні былі, карова ацялілася, цяля выгадавалі і прадалі. Набылі авечак.

Бацьку майго не ўзялі ў армію, бо ў яго адно вока было пакалечана ў грамадзянскую вайну. Дрэнна бачыў. Было яму ў пачатку вайны сорак гадоў.

Немцы загадалі паліцаям выбраць старасту вёскі. Прыйшоў аднойчы да нас бацькавы дваюрадны брат, Штыраль, які раней за ўсіх запісаўся ў паліцыю. Зайшоў у хату, селі за стол. Гутарылі, выпівалі. Раптам пачаў бацьку ўгаворваць, каб пайшоў у паліцыю. “Які ж з мяне паліцай з адным вокам”, -- смяецца бацька. “Ну, тады, -- кажа паліцай, -- будзеш старастай”. Бацька зноў: “Не”. Штыраль за ружжо. А бацька разважае ўслых: “Навошта мне, Аляксеевіч, да немцаў на службу ісці? Ты пайшоў, дык ты ж крыўду на саветаў маеш за раскулачванне, а мне на каго крыўдаваць? Хто яго ведае, як яшчэ будзе”.

Хітры быў мой бацька!

Паліцай раззлаваўся: “Не пойдзеш –- заб’ю”. І стрэліў у столь. Мы з маткай сядзелі на печы. А печ у нас была высокая! Ён толькі сказаў гэта -- я як скокну з гэтай печы і да паліцая адразу, хапаюся за ружжо. “Спачатку забівай нас, дзядзька, а потым бацьку!” –- крычу. Ён і рукі апусціў. Так і пайшоў, і больш да бацькі не прыставаў. Старастам выбралі тады нашага суседа.

Памятаю адзін восеньскі дзень, цёплы-цёплы. Ідуць па вясковай вуліцы два немцы, у форме, прыгожыя салдацікі. Не спяшаюцца, “гергэчуць” штосьці. Я стаю на вуліцы, ля хаты, на акне ў нас ляжыць пяць яек. Сястра Маня ў хаце. Я кажу: “Маня, Маня, схавай тры яйкі, толькі два немцам дадзім”. А тыя “немцы” пачулі і кажуць: “Малайцы, дзяўчаты, не любіце фашыстаў!” Гэта былі пераапранутыя партызаны.

Бацька ў той час будаваў хлеўчык, крыў яго саломай. “Партызаны прыехалі”, -- ціхенька нам кажа. Злез з даху і схаваўся ў той хлеў, каб яго не ўбачылі. Не ўсім жа наліваць ды сала падаваць!

Аднойчы прыехалі ў Галавічы немцы і арыштавалі бацьку. Нехта данёс, што ён быў галоўным арганізатарам калгаса і здымаў ў царкве званы. У Галавічах царква была вялікая, з трыма купаламі. У трыццаць сёмым з царквы зрабілі калгасную клець. Людзі пад прымусам здымалі званы, бацька на возе адвозіў іх у раён. Вось і нагаварыў нехта. Яшчэ быў на яго злы паліцай, якога да вайны раскулачылі. Наш бацька на сваім возе адвозіў таго раскулачанага ў Дрыбін. Дык ягоная жонка на каленкі станавілася перад немцамі, прасіла, каб бацьку расстралялі. Таму немцы пасадзілі бацьку пад замок. Выратавала цуда. Староста вёскі, сусед наш, я ўжо казала, добры бацькавы знаёмы, заступіўся.

Хата наша стаяла з краю вёскі, каля рэчкі Проні. Калі ў Галавічы пачалі заходзіць партызаны, перш за ўсё стукалі да нас. Прыходзілі па начах. Маці дасць ім гарлач малака, хлеба, сала кусок укіне, калі ёсць. А няма –- дык няма. Пасядзяць з бацькам, пагавораць ціхенька.

Зрабілі яго сваім сувязным. Памятаю аднаго партызана, Ваньку Чубатага. У яго былі чорныя валасы. Бацька з ім гутарыў, расказваў, колькі ў вёсцы паліцаяў, ці прыходзілі немцы.

У паліцыю з вёскі пайшлі многія. Чаму пайшлі? Калгасы не любілі. Мы ўжо восем ці дзесяць гадоў жылі ў калгасах, некаторыя нашы людзі іх ненавідзелі. Тым паліцаям выдалі вінтоўкі, апранулі іх добра.

А ў партызаны ніхто не пайшоў: у вёсцы засталіся толькі маладзенькія хлопчыкі ды старыя мужыкі.

Быў, праўда, адзін лейтэнант малады, Іван Лусцікаў, які да вайны скончыць ваеннае вучылішча. Калі чырвоныя прабіваліся з акружэння, ён застаўся ў роднай вёсцы. У партызаны не пайшоў. Прыходзілі да яго, прасілі, а ён не жадаў, і ўсё.

У той дзень, калі пад выглядам немцаў партызаны прыйшлі ў Галавічы, яны заходзілі да яго. І да дырэктара нашай сямігодкі, што ў Карэбах, зайшлі.

Дырэктар жыў наводшыбе, амаль за вёскай. Партызаны да яго прыходзілі і раней, прасілі, каб ён пайшоў кладаўшчыком да немцаў, браў для іх хлеб. Дырэктар адмовіўся, можа, за жонку з дочкамі хваляваўся. Дык вось, пачалі тыя “немцы” з ім размаўляць, правакаваць. А ён не зразумеў, не раскусіў. Сам савецкую ўладу любіў, пры ёй у людзі выйшаў, а тут разгубіўся і сказаў не тое. Каля яго жыла ў сваёй хатцы адзінокая жанчына. Яна гнала самагонку і аддавала партызанам. Вось ён і кажа пераапранутым партызанам: з ёй -- асцярожней, туды ходзяць партызаны.

Не ведаю, адкуль дазнаўся бацька, але у той жа дзень ён сказаў нам: “Сёння вечарам прыйдуць забіваць дырэктара”. Так і выйшла.

Ноччу партызаны забілі ў Галавічах лейтэнанта Івана Лусцікава, расстралялі былога кіраўніка калгаса, які працаваў на немцаў. Пайшлі да дырэктара школы. Той ужо ведаў, што за ім прыйдуць. Пачуў стрэлы і збег. Па бульбоўніку, праз поле.

Партызаны зайшлі ў хату -- яго няма. Толькі жонка і трое дзяцей. Яны: “Дзе?”. Яна: “Не ведаю”. Яны тады: “Забірай дзяцей, выганяй скаціну з хлява”. Дапамаглі нават швейную машыну вынесці і падпалілі іх хату.

Гэта было на досвітку. Прачынаемся: бачым вялікі агонь. Усе спалохаліся, думаем, што немцы падпалілі вёску. Цёпла, суха, вецер. Пачалі хто што браць -- і на вуліцу. Я разгубілася, толькі і прыдумала, што схапіць гарбузныя семкі. Потым усе з мяне смяяліся: Таня з семкамі з полымя выбегла!

Дырэктар школы на другі дзень паехаў у магістрат у Дрыбін, пачаў там працаваць. Адзін раз, у канцы вайны, калі немцы ўжо адступалі, зайшоў да нас. Казаў з горыччу майму бацьку: “Шчаслівы ты чалавек! Дачакаўся ўсё ж такі сваіх, а я, дружа, прагарэў. І чаму я так зрабіў?” Потым, калі вайна закончылася, дырэктар той застрэліўся.

Немцы ў Галавічах не стаялі. Заязджалі зрэдку, каб набраць паліцаяў ці людзей пастрашыць. Давалі старасце загад: сабраць яйкі, сена. Хлеб, як змалоцім, на вазах адвозілі на станцыю. Кажухі збіралі, адзін і ў нас узялі. Загадвалі вязаць шкарпэткі, цёплыя рукавіцы. Баяліся нашай зімы.

Пасля той ночы, калі партызаны прыходзілі ў вёску, прыехаў да нас карацельны атрад.

Сагналі ўсіх у калгаснае гумно, што стаяла ў канцы вуліцы. Зачынілі дзверы. Усе плачуць, думаюць, што будуць нас паліць. Чакалі ў тым хляве сваёй смерці. Але ж не, выпусцілі. Паставілі ў радок, узялі аднаго мужыка старога, што знайшоў недзе бочку спірту. Гэты стары паіў усіх: і немцаў, і

паліцаяў, і партызан. Даняслі, што ён партызан поіць. Насупраць нашай хаты стаяла хата мужыка, што ваяваў у Фінскую вайну. Ён быў інвалід, узнагароджаны савецкім ордэнам. І яго ўзялі. Вывелі іх на луг, што насупраць фермы, паставілі і расстралялі перад усімі. Немцы стралялі, не паліцаі. Прыехала немцаў чалавек пяць-шэсць.

Прыязджалі потым яшчэ раз. Усіх не зганялі. Прайшліся па хатах. Забілі жанчыну, што гнала самагонку. Дзяцей не чапалі. Забілі таксама жонку таго салдата, што ваяваў у Фінскую.

У сорак другім годзе мы засеялі свае гектары, узялі добры ўраджай. Бацька вучыў нас малаціць цапамі. Раніцай маці паліць печ, а мы з бацькам і сястрой Маняй ідзём малаціць. Намалацілі -– добра. Былі ўжо рады і так жыць. Адно ж лепей, чым паміраць.

Мне споўнілася васемнаццаць. Хацелася на танцы. Абутку не было. Хадзілі хто ў чым: у лапцях, у валёнках. Летам з вяровачак плялі чунькі. Рабілі калодкі. Былі ў мяне туфлі, але я іх захоўвала на будучыню. Пасля вайна паехала ў Мінск вучыцца ў тых туфлях.

Купіць нешта на ногі можна было толькі ў Магілёве. Вось я і пайшла туды, на кірмаш, за шэсцьдзесят кіламетраў. Маці сабрала масла ў бутэльку, і мы з сяброўкамі, утрох, пайшлі пешшу ў горад. Кірмаш там быў вялікі. За тыя грошы з масла купіла я сабе галошы.

Танцы ў Галавічах былі кожную суботу, а то і ў нядзелю, і па святах. І гарманіст быў, Ханок. Вельмі добра граў.

Кожная дзеўчына па чарзе павінна была знайсці месца для скокаў, калі свая хата малая і не падыходзіць. Да мяне заляцаўся адзін хлопец, дык прыбягаў з суседняй вёскі. Нават праз лес хадзіць не палохаўся! З мяне танцорка была дрэнная, часцей сядзела ў кутку. І паліцаі, якія маладыя, таксама прыходзілі на танцы. Што ж нам рабіць, не прагоніш жа іх, каб потым немцам расказалі.

Было ў нас адно вяселле. У царкве. Пры немцах яе зноў адчынілі. Усё ўнутры прыбралі. У каго былі, прынеслі абразы. Бацюшка прыехаў аднекуль. Высокі, прыгожы, малады. Не ўмеў чытаць па-стараславянску, мая мама яго вучыла. Пасля даведаліся, што ён быў партызанам.

У сорак трэцім годзе мы пачулі: немцы адступаюць. Іх перамаглі на Курскай дузе. Адступаюць яны да нашых Галавічаў. У нашу хату пасялілі пяць немцаў, лёгкапараненых. Стварылі ў хаце медсанбат.

Немы былі нейкія добрыя. Асабліва запомніўся адзін. Паказваў нам фотаздымкі. Кажа: "Вось я працую на лесапільнай фабрыцы. Жонка ў мяне, два сыны. Мы працуем, вы працуеце. Вайна нам не патрэбна. Хай Сталін з Гітлерам б'юцца”

Давалі ім добрыя пайкі, шакалад, шампанскае. Ён возьме, шакалад нам, дзецям, дасць, а шампанскае з дзедам вып'е. Месяцы са два стаялі ў нас гэтыя немцы. Павылечвалі іх, павезлі на фронт.

Хадзілі мы ўжо ў гэты час траншэі капаць. Першая лінія ішла каля нашага дома, каля Проні. Другая лінія была за вёскай. Капалі пад наглядам

немцаў, паліцаям яны не давяралі. Немец ходзіць: "Шнэль, шнэль, шнэль". Кнут трымае: сцёб таго, хто стаіць. Пайшой далей.

Выкапалі мы тыя акопы. Чуем: страляюць ужо за Проняй. Бух-бух! Самалёты нашы бамбяць ужо з гэтага боку, каля вескі, бомбы падаюць. Адна хата загарэлася. Вечарам усе сабраліся, ведалі, што каля вёскі будзе нямецкая перадавая. Вырашылі: трэба ўцякаць.

Мы ўзялі карову, трошкі сала, хлеб, рэчы цёплыя, бо зіма хутка. Усё іншае ў нас было закапана раней, адчувалі, што прыйдзецца бегчы. У хляве, дзе стаяла карова, паднялі гной, закапалі бочку з пшаніцай, сала. Схавалі сундук з адзежай. Веласіпед -- і той бабка мая закапала. Усе людзі так рабілі, не толькі мы.

Уцякалі хто куды. Вёска апусцела. За два кіламетры ад вёскі былі равы, ярамі іх звалі. Там рос арэшнік, туды за арэхамі хадзілі. Уся вёска ў тых равах хавалася. Паставілі падводы, сядзелі пад кустамі. Коні там пасвіліся, каровы. Нашы бамбілі, але ў роў не трапілі. Адна дзяўчына выйшла з рова, пайшла ў лес. Яе адразу немцы забілі. Думалі, што партызанка. У тым лесе забілі семнаццаць мужыкоў. Хадзілі і крычалі: "Партызан, партызан!"

Дзень сядзім у тым рове. Немцы праводзяць свае правады. Цягнуць праз роў, каля нас, увагі, здаецца, на нас не звяртаюць.

Раніцай немцы зноў прыйшлі. Збіраюць правады. Мы ціхенька сабе радуемся: немцы адступаюць, мы застаёмся дома. Але ж дачасна радаваліся. У той жа дзень немцы нас сабралі і сказалі: "Авэк!" Пастроілі ў калону, вывелі на дарогу, пад канвоем з немцаў і паліцаяў пагналі на Магілёў. Дарослыя ішлі пехам, дзеці ехалі на вазах.

З Магілёва нас накіравалі на Шклоў. Дайшлі да вёскі Александрыя. Там жылі каля месяца. У Александрыі немцы забралі нашу карову, усіх перапісалі, не дазвалялі выходзіць з вёскі.

Зноў мы ў калоне. Пагналі на Коханава, станцыю за Воршай. Там пагрузілі нас ў таварняк. У глухім вагоне ехалі праз Мінск на Баранавічы. Не дазвалялі выходзіць у туалет.

Прывезлі нас некуды. Зноў пастроілі ўсіх. Пад канвоем пагналі ў лагер Лясная. Недзе каля Баранавічаў. Агароджа з калючага дроту, вялізная брама з вартавымі. Ліў дождж. Шмат там ужо было народу. Многа баракаў, навесы, пад якімі мы сядзелі. У нас усіх была кароста, вошай было на нас. На мне была кофтачка бардовая. Як адхіну складку -- вошы сядзяць белым ланцужком. Раз па іх пальцам -- і ў вогнішча іх, толькі "трэсь, трэсь, трэсь". Гарацъ тыя вошы.

Маму з малым братам адвялі ў барак. Яна як зайшла, вошы толькі трашчаць пад нагамі. Вярнулася да нас, пад навес. Так мы сядзелі каля месяца. Адбывалі, як казалі немцы, каранцін. Яны вельмі баяліся тыфусу. Кармілі нас адзін раз у дзень. На трох чалавек давалі цагліну хлеба з апілкамі, чарпак баланды, каву з ячменю.

Каранцін скончыўся. Немцы па спісах сталі адбіраць працаздольных, каб адправіць у Германію. Мяне маглі ўзяць. Выпускалі ўсіх з лагера, аглядалі каля брамы. Сястру маю, Маню, мы закрылі анучамі, адзежай старой. На мяне надзелі кажух, завязалі хустку, на рукі

пасадзілі маленькую сястрычку стрыечную. Падходзім да немца, яна крычыць: "Мамачка, міленькая! Баюся" Прайшлі мы так праз агляд. У Германію не ўзялі.

Паслалі ў Дамашы працаваць. Пад Баранавічамі такая вёска. Есці не было чаго. Жабравалі. Але мясцовыя людзі мала што давалі: надакучылі бежанцы. У Дамашах завялі нас у школу. Стараста загадаў людзям браць нас па хатах. Усіх разбіраюць, мяне ніхто не бярэ. Я страшная, худая. Трапіла нарэшце да краўца Алеся. Добры быў чалавек. Вечарамі ткала для іх кросны, днямі працавала.

У Дамашах мы сустрэлі нашых. Два дні сядзелі ў склепе, перачакалі бой. Немцы адышлі. Наша сям"я адразу стала збірацца ў родную вёску. Ехалі праз Старыя Дарогі, лесам. У лесе сустрэлі партызан. "Паліцаі, паліцаі!" -- крычалі на нас. Забралі каня.

Прыехалі ў Галавічы -- усе вяскоўцы ужо там. Мы апошнія. Ніводнай хаты не засталося. Усе згарэлі. Дзе толькі печ чарнела, дзе слупок які. Ні платоў, ні дрэваў. А было больш за сто двароў.

Адкапалі пшаніцу, сала. Веласіпед адкапалі. Трохі было што паесці. На нашым двары немцы зрабілі бункер. Там мы зімавалі. Уся вёска сустрэла зіму ў такіх бункерах. Іх было шмат.

Першая лінія фронту стаяла каля вёскі дзевяць месяцаў. Усё навокал было замініравана. Пакуль мы прыехалі, чалавек восем ужо падарваліся. Маладая жанчына пайшла мыцца да Проні, якраз насупраць нашай хаты. На міну ступіла -- адарвала нагу. Памерла. Мужчына знайшоў гранату, хацеў рыбу глушыць у рэчцы. Парвала на шматкі. Так і пахавалі. Руку вясной ў Проні вылавілі...

Хату у першы год не будавалі. Бацьку забралі ў будаўнічы атрад, я паехала ў Мінск вучыцца. Толькі ў сорак шостым пачалі будаўніцтва. Хадзілі ўдваіх з бацькам у наш бор, пілавалі дрэвы, скідалі іх у Проню, звязвалі ў платы. Прыганялі бліжэй да вёскі. Пасля вайны было вельмі цяжка...”

Да салдат, якія з боем выходзілі з акружэння, савецкае камандаванне звычайна ставілася як да шпіёнаў. Іх адпраўлялі ў Сібір. Падазроныя адносіны да тых, хто жыў на акупаванай тэрыторыі, існавалі доўга пасля вайны. Нават у анкеце пра гэта патрабавалася пісаць.

Таму, напэўна, пра жыццё на акупаванай тэрыторыі, пра гэтую Ціхую Айчынную вайну, у нас і гаварылі, і пісалі мала, скупа. Разважалі так: дзе ж тут гераізм? Іншая справа –- вайна франтавая або партызанская.

Згодна з планам “Ост”, які быў распрацаваны Гімлерам, семдзесят пяць працэнтаў насельніцтва Беларусі фашысты збіраліся знішчыць. Дзякуй Богу, жудасны план яны не выканалі. Чаму? Хітры Хомка перашкодзіў.

Выкрутлівы, разважлівы, Хомка ўвабраў у сабе ўсе тыпова-беларускія якасці, якія і дапамаглі нашаму народу выйсці з вайны ў асноўным жывым. Ды не проста выжыць, а захаваць сям’ю, выгадаваць дзяцей. Для

абяскроўленай вялізнымі людскімі стратамі Беларусі хітры Хомка выратаваў чатырох маладых грамадзян! Хіба ж гэта не подзвіг? Хіба ж Хомка не герой?

Ці ж не рызыкаваў Хомка жыццём, калі пасярод страляніны браў у рукі касу, запрагаў каня, ехаў на пашу? Не рызыкавала Таццяна Гузава, якая хадзіла пешшу ў Магілёў за галошамі для танцаў? Танцы ў той час, калі на фронце льецца кроў, -- гэта кашчунства, -- скажа нехта. Не пагаджуся. Вайна не змагла выбіць беларусаў з жыццёвай каляі, не прымусіла іх спыніць сеяць хлеб, кахаць, нараджаць дзяцей. Сваім жаданнем жыць яны таксама перамогу "набліжалі, як маглі". Гэта жаданне і ёсць Ціхая Айчынная вайна беларусаў 1941-1944 гг.

Сучасныя немцы ў знак прымірэння вырашылі заплаціць беларусам за пакуты. Кампенсацыю павінна была атрымаць і Таццяна Гузава. Але не атрымала. Не атрымаў нямецкіх грошай ніхто з вёскі Галавічы. Жыхары яе пад прымусам працавалі на немцаў, сталі бежанцамі. "Празявалі свае грошы, -- упікнулі іх беларускія чыноўнікі, -- трэба было чытаць газету "Рэспубліка".

Апошні тэрмін, калі можна было падаць заяўку на кампенсацыю, скончыўся. "Пасля 31 студзеня 2001 года прэтэндэнт губляе права на атрыманне кампенсацыі" – так патрабуе нямецкі закон. Не ведалі? Ваша праблема.

Жыхары суседніх з Галавічамі вёсак кампенсацыю атрымалі. "Сельсавет, напэўна, дапамог. У час вайны наша вёска належала да Карэбскага сельсавета. З усіх навакольных вёсак згарэла толькі яна. Потым Галавічы перавялі ў сельсавет Першамайскі. Мабыць, калі пачалі выдаваць грошы, па старой памяці Галавічы палічылі "карэбскімі". Не пацярпеўшымі. Таму і не далі нічога. Не ўнеслі нас, галавічан гаротных, у спіс". Так мяркуе Таццяна Фамінічна.

Зараз немцы кажуць, што закон не адменяць. Ды і не думалі яны, напэўна, што ў краіне, якая знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, людзі пазбаўлены інфармацыі. Што нехта можа пра кампенсацыю не ведаць. Што нехта не паспее падаць заяву. І што чыноўнікі-фармалісты з Беларускага фонду "Узаемаразуменне і прымірэнне" зноў праваронілі чалавека.

***Мікола Казловіч***,

2004